# РАЗВІЦЦЁ ПАЧЫНАЕЦЦА З НАРАДЖЭННЯ

*Творчы калектыў аўтараў, які працаваў над стварэннем праграмы «Пралеска», завяршае сваю працу над абноўленым варыянтам праграмы. У ім прадстаўлены як базіснасць (стандарт, аснова развіцця), так і шляхі яе рэалізацыі. Тым самым пашыраны магчымасці педагогаў для творчага ўвасаблення таго, што ляжыць у аснове праграмы. Між іншым, сам базіс, стандарт дашкольнай адукацыі разглядваецца не як мінімум дасягненняў дзіцяці. Наша разуменне стандарту будуецца на «Канвенцыі аб правах дзіцяці» (1989), якая абвяшчае права на развіццё разумовых, духоўных і фізічных сіл у іх самым поўным аб'ёме (што збліжае нас з аўтарамі шэрага іншых сучасных праграм, напрыклад, «Истоки»). У аснову праграмы «Пралеска» пакладзена канцэпцыя псіхалагічнага ўзросту, дзе ўзрост цесна звязаны з ростам і развіццём арганізма, але не вызначаецца колькасцю пражытых гадоў (храналагічны, альбо пашпартны ўзрост). Гэта адносна замкнуты цыкл дзіцячага развіцця, які мае сваю структуру і дынаміку. Працягласць гэтага цыкла вызначаецца ўнутраным зместам. Кожны ўзроставы перыяд характарызуецца «спецыфічнай сітуацыяй развіцця» (Л.С.Выгоцкі), пэўнымі суадносінамі паміж умовамі сацыяльнага асяроддзя і ўнутранымі, канкрэтнымі новаўтварэннямі, іх своеасаблівым спалучэннем, вядучай дзейнасцю, якая ў найбольшай ступені абумоўлівае якасныя змяненні ў псіхіцы. Абапіраючыся на дадзены падыход, праграмай «Пралеска» вызначаны наступныя псіхалагічныя ўзросты:*

*— ранняе дзяцінства:*
- *маленства (ад нараджэння да аднаго года) — група «Малютка»;*
- *ранні ўзрост (ад аднаго года да трох гадоў) — група «Маляты»;*

*— дашкольнае дзяцінства:*
- *малодшы дашкольны ўзрост (ад трох да пяці гадоў) — група «Чамучкі»;*
- *старэйшы дашкольны ўзрост (ад пяці да шасці — сямі гадоў) — група «Фантазёры».*

*Акрамя ўжо вядомых раздзелаў, такіх, як «Пазнаць, каб выхаваць», «Расці здаровым, малыш», «Супрацоўнічаем з сям'ёй», уведзены новы — «Умовы ўвасаблення Праграмы ў педагагічную практыку». Базісную частку Праграмы кожнай групы складаюць такія кампаненты:*
- ✓*характарыстыка ўзроставых магчымасцей псіхалагічнага развіцця дзіцяці;*
- ✓*задачы развіцця, выхавання і навучання;*
- ✓*паказчыкі развіцця;*
- ✓*базісныя характарыстыкі асобы дзіцяці кожнага вызначанага ўзроставага перыяду.*

*Карэкціруючы «Пралеску», мы імкнуліся ўлічыць заўвагі і прапановы педагогаў, якія працуюць па гэтай Праграме, адносна індывідуальна-дыферэнцыраванай работы з дзецьмі. Змест, формы і метады такой работы выдзелены ў асобны падраздзел для кожнай групы — «Дапаможам нашым дзецям».*

*Прапануем нашым чытачам пазнаёміцца з новымі матэрыяламі праграмы «Пралеска». Пачынаем з групы дзяцей першага года жыцця — групы «Малютка».*

## Характарыстыка псіхалагічнага і фізічнага развіцця дзяцей групы «Малютка»
(першы год жыцця)

> *«... адносіны дзіцяці да рэчаіснасці аказваюцца з самага пачатку сацыяльнымі адносінамі. У гэтым сэнсе дзіця можна назваць максімальна сацыяльнай істотай...»*
>
> **Л.С.Выгоцкі**

Дзеці першага года жыцця, нашы малюткі... У гэты перыяд як ніколі інтэнсіўна развіваецца іх псіхіка. Самыя малодшыя і пакуль бездапаможныя — *нованароджаныя*.

З нараджэннем на працягу літаральна некалькіх секунд так многае змяняецца ў арганізме кожнага з іх — тэмпература, тып дыхання, харчаванне, кровазвароту. Дзіця пераходзіць у новыя ўмовы жыцця: ад цемры да святла, ад адносна пастаяннай, высокай тэмпературы ў арганізме маці (37° С) ва ўмовы з паніжанай тэмпературай.

Увесь яго арганізм адрэагаваў на істотныя змяненні, на новыя раздражняльнікі ў гэты крытычны перыяд.

У дзеянне ўступілі безумоўныя рэфлексы, накіраваныя на задавальненне арганічных патрэбнасцей у кіслародзе, ежы, цяпле і інш., абаронныя (адхопліванне ручкі, ножкі на раздражненне скуры, зажмурванне, звужванне зрэнкаў пры моцным святле, морганне). Праяўляюцца ў нованароджанага і некаторыя атавістычныя рэфлексы, якія засталіся ад далёкіх продкаў і якія знікаюць ужо на працягу першых месяцаў жыцця (напрыклад, рэфлекс Робінсана — «малпін» — дзіця можа чапляцца, сціснуўшы кулачок, і вісець на адной руцэ без бачнай стомленасці і інш.).

Адразу пасля нараджэння ўключаюцца ў работу асноўныя органы пачуццяў: зрок, слых, датыкальны, рухальны, смакавы аналізатары.

Гатоўнасць да функцыянавання з нараджэння выказвае галаўны мозг дзіцяці, які мае свае асаблівасці (нервовыя клеткі нованароджанага надзвычай няспелыя, а сувязі паміж імі вельмі слабыя). Нованароджаны здольны літаральна з першых дзён жыцця

адрозніваць вонкавыя ўздзеянні па паху, смаку, колеры; гукі — па гучнасці, вышыні, тэмбру.

Аднак, спадчынных механізмаў, прыродных дадзеных недастаткова, каб дзіця само магло прыстасавацца да новага асяроддзя, пераджыць крытычны перыяд свайго жыцця. Малютку неабходна карміць, паіць, аберагаць ад пераахаладжэння, а часам і ад перагравання, ад яркага святла, шуму... Сам нованароджаны яшчэ не валодае ніводнай сфарміраванай формай паводзін — іх яшчэ належыць набыць пры жыцці. Цяжка знайсці найбольш бездапаможную істоту, чым дзіця ў першыя дні і месяцы жыцця, таму пераход да новага тыпу функцыянавання, выжывання, адаптацыі немагчымы без дарослага.

**На працягу першага месяца ў дзіцяці ўзнікаюць і першыя ўмоўныя рэфлексы (на час кармлення і становішча дзіцяці пры кармленні), з'яўляецца здольнасць фіксаваць погляд на прадмеце, засяроджвацца на ім.**

*Асноўнае новаўтварэнне гэтага перыяду — з'яўленне ў дзіцяці патрэбнасцей у зносінах з дарослым.* Малыш адрознівае твар маці альбо іншага дарослага, засяроджваецца на ім і ўсміхаецца ў адказ. Усмешка дзіцяці — не толькі адлюстраванне задавальнення, гэта першы сацыяльны жэст, з дапамогай якога яно будзе заяўляць аб сабе, сваіх прыметных адчуваннях блізкаму чалавеку, які яго даглядае. З'яўленне ўсмешкі азначае канец перыяду нованароджанасці, пераход дзіцяці на наступную ўзроставую ступень — *маленства.*

Інтэнсіўна адбываецца развіццё дзіцяці ў гэты перыяд. Асаблівасці гэтага працэсу вызначаюцца сацыяльнай сітуацыяй развіцця дзіцяці, для якой характэрна непарыўнае адзінства дзіцяці і дарослага. Не выпадкова Л.С.Выгоцкі назваў яе сацыяльнай сітуацыяй «Мы» — жыццё дзіцяці ў гэты перыяд «уплецена» у жыццядзейнасць дарослага, які даглядае яго.

Прыстасаванне малыша да наваколля адбываецца ці апасродкавана праз іншага чалавека, ці ў цесным кантакце з ім. Дарослы для яго — «псіхалагічны цэнтр усялякай сітуацыі». Спецыфіка сацыяльнай сітуацыі, у якой знаходзіцца дзіця, спрыяе ўзнікненню вядучага ў дадзены перыяд віду дзейнасці — *эмацыянальна-асобасных зносін.*

На працягу перыяду маленства фарміруюцца спосабы ўзаемадзеяння дзіцяці з дарослым.

**«Комплекс ажыўлення» — важны набытак.** Ён уключае ў сябе пільны погляд на дарослага, усмешку, рухальнае ажыўленне і *ўзнікае прыкладна на трэцім месяцы жыцця.*

Такія паводзіны дзіцяці інтэнсіўна фарміруюцца да чатырох месяцаў і становяцца асноўнай формай праяўлення яго станоўчых эмацыянальных пачуццяў. «Комплексам ажыўлення» малыш адказвае не толькі на словы дарослага, а і на спевы, на гучанне музычных інструментаў, на прыемныя для яго ўражанні. З часам дзіця само пачынае праяўляць ініцыятыву ў зносінах з дарослымі, адносіны да якіх з другога паўгоддзя становяцца дыферэнцыраванымі.

Знаёмыя часцей за ўсё выклікаюць у дзіцяці роўныя, спакойна-станоўчыя адносіны, пры сустрэчы з незнаёмым дарослым узнікае напружанасць, страх, хваляванне.

Найбольш разнастайную гаму эмоцый выклікае блізкі дзіцяці дарослы: захапленне пры сустрэчы, засмучэнне пры развітанні, радасць у час сумесных зносін, гульняў, крыўду — пры забароне.

Паміж блізкімі дарослымі і малым узнікаюць асаблівыя, *афектыўна-асобасныя сувязі,* нараджаецца прыхільнасць. З гэтым набыткам у дзіцяці звязана з'яўленне пачуцця ўпэўненасці ў сабе.

Пасля шасці месяцаў дзеці цяжка перажываюць расставанне з маці і з цяжкасцю прывыкаюць да новых дарослых.

Для другога паўгоддзя жыцця дзіцяці характэрна яшчэ адно новаўтварэнне — *сітуатыўна-дзелавая* форма зносін, апасродкаваных з прадметамі. Ідзе актыўная падрыхтоўка да з'яўлення маўлення.

**Інтэнсіўна фарміруецца ў гэты перыяд разуменне дзіцем мовы дарослых (пасіўнае маўленне).** Першапачаткова разуменне слоў праяўляецца ў дзіцяці ва ўменні знаходзіць вачыма прадмет, які называе дарослы (калі прадмет мае сваё пастаяннае месца — у *6 — 7 месяцаў),* пасля малыш можа адшукаць рэч у любым месцы; дзіця здольна выканаць нескладаныя рухі пры называнні іх дарослым *(7 — 8 месяцаў),* пачаць дзеянне пад уплывам вуснай інструкцыі дарослага, дазволу — «можна», альбо спыніць яго пры забароне — «нельга» *(11 — 12 месяцаў).*

Развіваюцца і ўласныя рэакцыі дзіцяці, якія маюць характар перадмоўных вакалізацый: у першым паўгоддзі — ускрыкі, гуканне *(«іі», «хм»* і інш.), гуленне (працяглыя гукі *«а-а-а»* і інш.), у другім — у сітуацыях узаемадзеяння з дарослым з'яўляюцца выразныя, ясныя гукі — лепет, своеасаблівыя тырады з пэўным інтанацыйным малюнкам *(«ба-ба-та», «та-та-да»* і г.д.).

Да канца першага года жыцця ў працэсе зносін дзіця пачынае вымаўляць першыя словы (4 — 20). Яны эмацыянальна афарбаваныя, маюць сітуатыўны характар і зразумелыя толькі блізкім людзям.

У працэсе зносін з дарослымі пачынае ствараецца вобраз «Я» дзіцяці, фарміруюцца асновы яго самасвядомасці. Адносіны малога да сябе вызначаюцца адносінамі да яго дарослых людзей. Для нармальнага развіцця неабходна станоўчае самаадчуванне дзіцяці.

**Актыўна развіваюцца ў маленстве рухі і органы пачуццяў.** Пры гэтым развіццё сенсорных працэсаў малюткі адбываецца больш актыўна, чым яго маторыка. Ужо ў першым паўгоддзі жыцця інтэнсіўна развіваюцца сенсорныя механізмы, перадумовы арыенціровачных рэакцый (засяроджванне, сачэнне за прадметам, кругавыя рухі).

✓ *Важнае новаўтварэнне першага паўгоддзя — узнікненне рэакцыі на навізну (у 4 месяцы), здольнасць да працяглага ўтрымання погляду на новым прадмеце.* Развіваюцца ў гэты перыяд слыхавыя адчуванні (з'яўляецца асобая рэакцыя на голас маці, дзеці прыслухоўваюцца да гучання музычнага інструмента, сочаць за яго перамяшчэннямі *(у 6 месяцаў),* дыферэнцыравана рэагуюць на афарбоўку цацак і г.д.). Атрымліваюць далейшае развіццё і іншыя органы пачуццяў дзіцяці (смакавы, тактыльны, нюхальны і іншыя аналізатары).

✓ *У ліку значных набыткаў малюткі — першае накіраванае дзеянне — хапальныя рухі* (звычайна — *у 5 месяцаў),* з якімі звязана ўзнікненне прадметнага ўспрымання, пашырэнне магчымасцей маніпуліравання прадметамі. Затым з'яўляюцца ўказальныя рухі (у адносінах да знаёмых прадметаў), пэўныя дзеянні, якія адпавядаюць канцу маленства,

— і першыя функцыянальныя дзеянні з прадметамі (адчыняе, зачыняе скрынкі, пракочвае шар, мяч і г.д.). Пазнаёміцца з функцыяй прадмета малышу дапамагае дарослы, які выкарыстоўвае сітуатыўна-дзелавыя зносіны. Практычны кантакт з прадметамі, дзеянні з імі, цікаўнасць да прадметаў вядуць да адкрыцця новых уласцівасцей, да далейшага пазнавальнага развіцця. Аваподвае малютка і іншымі рухамі, у ліку якіх поўзанне, прысяданне, уставанне, хадзьба *(да года).*

**На працягу першага года змяняецца знешні выгляд дзіцяці, яго фізіялагічныя магчымасці.** Маса цела за гэты перыяд узрастае, як правіла, у тры разы, рост павялічваецца на 25 см. Мышцы канечнасцей развітыя слаба, напружанне тонусу мышцаў павышанае, косны шкілет мяккі, падатлівы, пазваночнік амаль не мае згібаў. Асноўныя морфафункцыянальныя звёны дыхальнай, сардэчна-сасудзістай сістэм сфарміраваныя ўжо к моманту нараджэння дзіцяці, аднак характар дыхання малога павярхоўны, адзначаецца высокая частата сардэчных скарачэнняў. На працягу года частата дыхання змяншаецца з 40 — 45 да 30 — 35 у мінуту, частата сардэчных скарачэнняў — з 125 — 140 да 110 удараў у мінуту.

Скура дзіцяці тонкая, пяшчотная, яе асаблівасцю ў гэтым узросце з'яўляецца ранімасць. Схільнасць немаўлят да апрэласцей, ранак патрабуе беражлівага догляду, якаснага адзення, асцярожнасці ў час гігіенічных працэдур.

Тэрмарэгуляцыя арганізма ў гэтым узросце яшчэ не дакладная, тэмпература цела дзіцяці можа хутка змяняцца пад уплывам знешніх умоў. Гэтыя змяненні адразу ж адбіваюцца на стане скурнага покрыва: пры пераахаладжэнні скура больш бледная, пры моцным пераграванні хутка з'яўляецца пот. Пры гэтым пераграванне немаўляты пераживаюць горш, чым пераахаладжэнне.

**Удасканальваецца цэнтральная нервовая сістэма малога.** У першыя месяцы жыцця маса мозгу павялічваецца штомесяц на 30 г, інтэнсіўна развіваюцца клеткі кары галаўнога мозгу, узрастае колькасць нервовых сувязей паміж рознымі клеткамі, а нервовыя валокны пакрываюцца слабай міелінавай абалонкай. Нервовая сістэма малышоў рэагуе не толькі на фізічныя, а і на псіхаэмацыянальныя раздражняльнікі. Спакойная, добразычлівая атмасфера вакол, задавальненне дарослым вядучых патрабаванняў дзіцяці (уражанні, зносіны) — важныя ўмовы яго фізічнага і псіхічнага здароўя.

Разам з тым, «набыткі» першага года жыцця (у першую чаргу — авалодванне маўленнем і хадзьбой) змяняюць сацыяльную сітуацыю развіцця дзіцяці. Малыш набывае некаторую самастойнасць. Ранейшая сітуацыя «Мы» — адзінства дзіцяці і дарослага — распадаецца. Ствараецца аснова для пераходу яго на новую ўзроставую ступень.

## КУЛЬТУРА

Першы год жыцця — гэта пачатак знаёмства з тым, што створана чалавекам. Робяцца самыя першыя крокі ў засваенні культуры — фізічнай, мастацкай, маральна-эстэтычнай.

Далучаючы да яе, мы ўлічваем як узроставыя асаблівасці немаўляці (пакуль што яшчэ вельмі абмежаваныя), так і індывідуальныя. Будзем імкнуцца, каб гэты працэс спрыяў здароўю дзіцяці — і фізічнаму, і псіхічнаму.

### ● ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА

*«... навучаць дзяцей можна толькі ў тым выпадку, калі яны жывыя і здаровыя, таму першы клопат бацькоў — аберагаць здароўе дзяцей».*

**Я.А. Каменскі**

#### ● Задачы выхавання

Развіваць абаронныя сілы арганізма, умацоўваць здароўе.

Пачаць далучэнне дзяцей да здаровага ладу жыцця.

Забяспечыць фізіялагічную сталасць сістэм і функцый арганізма з улікам узроставых магчымасцей.

Спрыяць своечасоваму ўзнікненню і развіццю статычных і лакаматорных функцый арганізма: уменне ўтрымліваць галоўку, пераварочвацца, стаяць на карачках, поўзаць, сядзець, хадзіць, кідаць прадмет.

Стымуляваць дзяцей да рухальнай актыўнасці, да самастойнага перамяшчэння ў прасторы.

Заахвочваць да ўзнікнення і ўдасканалення дзеянняў з прадметамі.

Выхоўваць станоўчыя эмацыянальныя адносіны да самастойных рухальных дзеянняў на аснове пачуцця «мышачнай радасці».

#### ● Змест і ўмовы выхаваўча-аздараўленчай работы

*Асноўныя шляхі рашэння задач, звязаных з фізічным развіццём немаўляці і замацаваннем яго здароўя.*

Строгае захаванне санітарных норм, правілаў аховы жыцця і здароўя дзіцяці, паўнацэннае харчаванне, правільная арганізацыя сну, прагулак, загартоўванне, гігіенічны догляд, псіхалагічны камфорт.

Стварэнне даверлівага кантакту з дзіцем, праяўленне індывідуальнага клопату аб кожным.

Стварэнне ўмоў для аптымальнай рухальнай актыўнасці.

Масаж, індвывідуальныя заняткі фізічнымі практыкаваннямі.

Стварэнне разнастайнага прадметна-прасторавага асяроддзя ў памяшканні, а таксама ўмоў, неабходных для бяспекі дзіцяці.

Праяўляючы клопат аб здароўі малыша, неабходна далучаць яго да здаровага ладу жыцця з першых дзён.

У сістэме важнае месца займае арганізаваны рэжым дня. Арганізм дзіцяці даволі пяшчотны, цэнтральная нервовая сістэма недасканалая, таму вельмі асцярожна, цярпліва, але разам з тым і настойліва трэба дапамагаць малышу ўвайсці ў вызначаны рытм, выпрацаваць так званы дынамічны стэрэатып да распарадку дня. Тады пераход ад аднаго віда дзейнасці да другога будзе ажыццяўляцца аўтаматычна. Прывучыць дзіця да пэўных паводзін — гэта значыць, аказаць неацэнную паслугу яго арганізму ў правільным функцыянаванні. Аснаўнымі кампанентамі рэжыму дня на першым годзе жыцця з'яўляюцца сон і няспанне ў адпаведных узросту суадносінах, кармленне.

У гэты перыяд рэжым строга індывідуальны і пераглядаецца кожны раз, калі дзіця пачынае паводзіць сябе неадэкватна (раней часу пачало прачынацца альбо засынаць, хутчэй стамляецца, капрызіць). Звычайна выдзяляюць рэжым дня для дзяцей *да 3 месяцаў, ад 3 да 6 — 7 месяцаў, ад 6 — 7 да 12 месяцаў.* Пры планаванні рэжыму дня абавязкова неабходна ўлічваць узроставыя нормы патрэбнасці ў сне.

Дзіця ад 1,5 да 3 месяцаў спіць удзень 4 разы па 1,5 гадзіны, ноччу — 10,5 гадзіны, не спіць 5 разоў па 1,5 гадзіны. Яго кормяць 7 разоў у дзень праз кожныя 3 гадзіны.

Малыш 5 — 6 месяцаў не спіць 4 разы па 2 гадзіны, спіць удзень 3 разы па 2 гадзіны, ноччу —

10 гадзін. Кормяць яго 5 разоў праз 4 гадзіны.

У 9 — 10 месяцаў дзённы сон у агульнай складанасці скарачаецца да 4 — 3,5 гадзіны, а сутачны — да 14 — 13,5 гадзіны. Пасля 10 месяцаў дзеці спяць удзень 2 разы.

Лепш за ўсё вызначыць наступны расклад: пакарміць дзіця пасля сну, стварыць умовы для яго актыўнага няспання, даўшы яму максімум волі для спантанных рухаў. Пад'еўшы, задаволіўшы сваю патрэбу ў рухах, малыш лёгка засынае і спіць спакойна, пакуль не захоча есці. Неабходна, каб у час сну ў памяшканні было чыстае паветра з крыху паніжанай тэмпературай, адсутнічала яркае святло, была цішыня, зручная пасцель.

Клопат аб рухальным развіцці дзіцяці з'яўляецца такім жа важным для яго здароўя і гарманічнага развіцця, як і рацыянальны рэжым, рэгулярнае і паўнацэннае харчаванне, дастатковы сон і знаходжанне на свежым паветры.

Для таго, каб дарослым было лягчэй сачыць за рухальным развіццём малыша і своечасова яму дапамагаць, трэба ведаць тэрмін узнікнення асноўных новаўтварэнняў у рухальнай сферы на першым годзе жыцця.

У немаўляці літаральна кожны месяц мае значэнне — такія вялікія набыткі ў гэты кароткі перыяд! *(Гл. табліцу на стар. 13.)*

Важна стымуляваць своечасовае ўзнікненне кожнага з гэтых рухаў.

Заваёўваючы прастору праз рухі, малыш пашырае поле сваёй жыццядзейнасці. Вядомы ўрач і педагог Я.А.Аркін сцвярджаў, што «увесь навакольны свет праламляецца ў дзіцяці праз прызму рухаў», і яркая эмацыянальнасць, якая характэрна для дзяцей на раннім этапе развіцця, у значнай ступені «жывіцца маторнай дзейнасцю».

Рашаючы задачы, звязаныя з развіццём рухаў немаўляці, дарослы адначасова спрыяе фарміраванню яго пазнавальнай і эмацыянальнай сферы, псіхікі ў цэлым.

Трэба ствараць умовы для рухальнай дзейнасці не толькі ў час няспання, а і ў час сну. Таму не трэба спавіваць дзіця — адзенне малога павінна даваць яму магчымасць рухацца. Акрамя гэтага, трэба пакідаць яго на кароткі тэрмін распранутым (у час пераапранання, перад купаннем), што таксама стымулюе яго рухальную актыўнасць.

Пачынаючы з 2 тыдняў, дзіця трэба класці на жывот, стымуляваць рух мышцаў шыі, поўзанне. Дзіця абавязкова трэба браць на рукі, паказваць яму цацкі, калі яно не спіць, падвешваць цацкі над ложкам.

Для актывізацыі рухальнага развіцця неабходна як мага раней *(з 3 — 4 месяцаў)* даваць дзіцяці дастатковую прастору.

Да сямі месяцаў добра ўтрымліваць дзіця ў шырокім манежы, пасля 6 — 7 — прыдатнай пляцоўкай з'яўляецца чыстая, гладкая падлога з падагрэвам. Раскладзеныя навокал яркія цацкі прымушаюць дзіця рухацца ў розных напрамках, асвойваць прастору.

Выкарыстоўваюцца бразготкі, лёгкія пластмасавыя мячы (для кідання і пракочвання), каталкі і іншыя цацкі. У другім паўгоддзі прыстасоўваецца спецыяльнае абсталяванне — стол-бар'ер, невысокія лесвіцы, плоскасныя дарожкі і інш.

Дарослыя стымулююць разнастайныя рухі і дзеянні з прадметамі і дапаможнікамі, гуляюць з дзіцем. Пры гэтым яны імкнуцца стварыць у малога радасны настрой. Нездарма прыказка гаворыць: «Вясёлы настрой — ужо палова здароўя».

Ствараючы спрыяльныя ўмовы для рухальнай актыўнасці немаўляці, трэба паклапаціцца і аб яго бяспецы: прыбраць навокал усе небяспечныя для дзіцяці прадметы.

Значнае месца ў сістэме фізічнага выхавання займаюць масаж і гімнастыка (спецыяльныя практыкаванні). Іх трэба праводзіць ужо з 1,5 месяца жыцця дзіцяці штодня.

Лічыцца, што няма ніводнага органа ці сістэмы, дзейнасць якіх не актывізавалася б у гэтым узросце пад уплывам фізічных практыкаванняў. Асабліва неабходныя масаж і гімнастыка для фізічна слабых дзяцей.

**Пералік гімнастычных практыкаванняў і прыёмаў масажу для дзяцей 1,5 — 12 месяцаў.**

Масаж рук, ног, жывата, спіны, ступней, грудной клеткі.

Выкладванне на жывот, рэфлекторнае поўзанне на жываце і адпіханне ног ад апоры ў становішчы лежачы на спіне; рэфлекторнае разгінанне пазваночніка, ног пры падтрымцы пад пахі; пасіўнае скрыжаванне рук на грудзях і развядзенне іх у бакі, чарганне згінання і разгінання рук у плечавым і локцевым суставах, пасіўнае згінанне і разгінанне ног разам і па чарзе; прысаджванне са становішча лежачы на спіне з падтрымкай, пасіўнае тупанне ў становішчы лежачы на спіне; пераступанне пры падтрымцы пад пахі; актыўнае прысаджванне пры лёгкім пацягванні за рукі, прысаджванне са становішча лежачы на спіне пры падтрымцы за адведзеную ў бок руку пры фіксацыі ног; поўзанне на карачках, уставанне на ногі пры падтрымцы рукамі, пераступанне пры падтрымцы.

Рухомыя гульні (індывідуальныя і з падгрупай з 2 — 3 чалавек): «Хованкі», «Дастань званочак», «Дзе мячык (коцік)?», «Скаці з горкі», «Дапаўзі да бразготкі», «У госці да зайца (коціка, сабачкі і г.д.)», «Ідзі да мяне», «Па роўненькай сцяжынцы».

Народныя пальчыкавыя гульні з пацешкамі: «Сарока-белабока», «Лады-ладкі», «Вясёлыя пальчыкі», «Па купінах, па купінах» і інш.

Выключнае значэнне для фізічнага развіцця малога дзіцяці, аховы і ўмацавання яго здароўя маюць эколага-гігіенічныя ўмовы: гігіена памяшкання, адзення, цацак, свежае паветра з тэмпературай не больш 18 — 22° С. Дастаткова на працягу некалькіх дзён патрымаць дзіця ў пакоі з больш высокай тэмпературай, паветра ў якім перасушана, як усе абарончыя сілы выключаюцца, не знайшоўшы прымянення. Тады нават невялікі скразняк альбо нязначны кантакт з хворым могуць выклікаць у дзіцяці хваробу. Дарослы павінен спрыяць развіццю абаронных сіл дзіцячага арганізма.

У значнай ступені гэтаму дапамагае загартоўванне — паслядоўнае павышэнне супраціўляльнасці арганізма шкодным уздзеяням навакольнага асяроддзя. Загартаваныя дзеці адрозніваюцца здаровым выглядам, у іх добры апетыт, спакойны сон, вясёлы настрой. Яны менш хварэюць, а калі гэта і здарыцца, то захворванне праходзіць лягчэй.

Асноўныя сродкі загартоўвання — паветра, вада, сонца.

**Сістэма загартоўвання ўключае ў сябе наступныя працэдуры:**

- *умыванне некалькі разоў у дзень вадой хатняй тэмпературы;*
- *падмыванне пры кожным пераапрананні цёплай вадой з паступовым пераходам да вады хатняй тэмпературы;*
- *паветраныя ванны (ад 2 мінут з паступовым павелічэннем*

*да 15 — 20 мінут) пры тэмпературы ў памяшканні 20 — 22⁰ С;*

- *рэгулярныя (некалькі разоў у дзень) прагулкі на свежым паветры;*
- *халаднаватае пітво (некалькі глыткоў экалагічна чыстай вады ў кожным перыядзе няспання);*
- *штодзённае купанне;*
- *сон пры паніжанай тэмпературы паветра.*

Важнай ўмовай рэалізацыі задач фізічнага выхавання з'яўляецца правільнае, рацыянальнае размеркаванне абавязкаў сярод супрацоўнікаў ДДУ пры арганізацыі жыццядзейнасці немаўлят.

Педагогі і бацькі цесна супрацоўнічаюць, праяўляюць адзінства патрабаванняў у падыходзе да дзіцяці пры рэалізацыі сістэмы фізічнага выхавання дзяцей да года (патрабаванні да рэжыму дня, правілаў догляду за дзіцем і г.д.).

## СВЕТ ЦУДОЎНАГА

*«Першааснова душэўнага харaства пачынаецца з калыханкі. На самай ранняй стадыі развіцця эмацыянальны фактар, безумоўна, галоўны і вырашальны».*

**В. Вітка**

Мастацтва, свет цудоўнага... Узаемадзеянне з дарослым дазваляе малышу ажыццявіць першае дакрананне да гэтага пласта чалавечай культуры — важнага, значнага і такога прывабнага. Прывабнага не толькі для дарослых, а і для маленькіх выхаванцаў. Малютка сціхае, супакойваецца пры гуках калыханкі, з задавальненнем слухае не толькі спевы, а і музыку, эмацыянальна рэагуе на напеўныя вершы, пацешкі, прыгаворкі, «выбірае» вочкамі самую яркую цацку і цягнецца да яе.

Віды мастацтва разнастайныя. Пачынаем далучаць дзіця спачатку да тых яго відаў, якія ўплываюць на самых ранніх этапах яго жыцця.

**У ліку асноўных задач будуць наступныя:**

- *узбагачаць дзяцей эстэтычнымі ўражаннямі;*
- *даваць малышам радасць ад сустрэчы з цудоўным (музыкай, спевамі, танцамі, музычнай гульнёй, зрыфмаванымі народнымі пацешкамі, дзіцячымі вершамі, народнымі цацкамі, яркімі карцінкамі і да т.п.);*
- *развіваць эмацыянальную спагадлівасць на даступныя для дзяцей творы мастацтва;*
- *далучаць малышоў да цудоўнага з мэтай фарміравання сенсаматорыкі, увагі, памяці, перадмоўных форм зносін, развіцця маўлення, паглыблення афектыўна-асобасных сувязей паміж дарослым і дзіцем.*

### Змест і ўмовы педагагічнай працы

Дарослы стварае асяроддзе, прыдатнае для далучэння дзіцяці да свету цудоўнага. У зносінах з малюткай, пры доглядзе за ім дарослы шырока выкарыстоўвае творы малога фальклорнага жанру. Прымаўкі, рыфмаваныя народныя пацешкі, скорагаворкі, дзіцячыя вершы ўзбагачаюць гукавое і моўнае асяроддзе, дапамагаюць не толькі засвоіць мову, развіць інтанацыйны слых, а і выклікаць чуллівасць на гучанне паэтычнага слова. У сваю размову з малышом, нахіліўшыся над ложкам альбо люляючы немаўля, дарослы ўключае напеўныя вершы.

*Плыві, плыві, лодка,*
*Засыпай, Ілонка!*
*Лю-лі, лю-лі,*
*Зоранькі паснулі.*
*Лю-лі, лю-лі, лю-лі!*
*Прыляцелі гулі!*
*Гулі-гулі-галубы!*
*Селі гулі-галубы!*
*Селі гулі на дубы*
*І спявалі, і гукалі —*
*Сны салодкія склікалі.*

Карысныя для слыху дзіцяці напеўныя, інтанацыйна-выразныя творы. Пры іх выбары трэба ўлічваць не толькі мэту ўзаемадзеяння, сітуацыю, пры якой яны будуць выкарыстоўвацца (важна, каб адпавядалі), а і ўзроставыя асаблівасці.

Так, у зносінах з дзецьмі ад 3 да 6 месяцаў для развіцця гулення, галасавых магчымасцей неабходна браць творы, якія ўключаюць галасавы напеў *(«Цілі-бом, цілі-бом...»)*.

У другім паўгоддзі творы малога фальклорнага жанру, дзіцячыя вершыкі выкарыстоўваюцца ўжо часцей для развіцця разумення мовы дарослага, у працэсе заахвочвання дзяцей да моўных зносін *(«Ладкі», «Баю-бай», «Маміна дачушка», «Кулачок», «Вочкі»* (Н.Тулупава і інш.). Выкарыстоўваюцца і пацешкі, песенькі, у якіх прысутнічае імя дзіцяці *(«Пайшоў каток на таржок»)*.

З мэтай развіцця ўмення імітаваць склады, якіх яшчэ няма ў маўленні дзіцяці, стымулявання новых слоў у зносінах з 9 — 12-месячнымі малышамі неабходна падбіраць такія пацешкі, дзе гэты склад быў бы пад «націскам» (напрыклад, склад «дзі» — *«Вадзічка, вадзічка»)*. Пацешкі, кароткія вершы дарослы можа чытаць пры знаёмстве дзіцяці з новай цацкай, іншым прадметам, засяроджваючы ўвагу малыша на прадмеце альбо карцінцы.

Важна, каб і самі прадметы былі эстэтычнымі, радавалі дзіця сваёй формай, афарбоўкай. Сярод цацак немаўляці ёсць і музычныя. Дарослы звяртае ўвагу малога на іх — змяшчае побач, каб дзіця само магло дацягнуцца да такіх прадметаў, прапануе іх малютцы, кранае рукой дзіцяці музычную цацку, дае магчымасць патрымаць яе, пагуляць, парадавацца мелодыі.

Музыка — той від мастацтва, да якога чалавек неабыякавы з першых дзён свайго з'яўлення на свет, і нават у больш ранні перыяд (на думку спецыялістаў, ужо ў перыяд унутрывантробнага развіцця музыка, якую слухае маці, аказвае ўплыў не толькі на самаадчуванне дзіцяці, а і, магчыма, на яго густ).

*«Музыка,* — адзначае вядомы кампазітар Дз.Дз.Шастаковіч, — *суправаджае чалавека на працягу ўсяго яго жыцця... Без музыкі цяжка ўявіць сабе жыццё чалавека. Без гукаў музыкі яно было б няпоўным, глухім, бедным».*

Далучаючы дзіця да музыкі, мы ўзбагачаем яго жыццядзейнасць, развіваем эмацыянальную адчувальнасць, слыхавае засяроджванне, спрыяем назапашванню яркіх музычных уражанняў.

Першыя сустрэчы з музыкальным светам адбываюцца ў працэсе слухання музыкі, спеваў дарослага (калыханак, танцавальных — *«Ах вы сені», «Лявоніха», «Крыжачок», «Полька-Янка»*, народных напевак з 1 — 3 гукаў — «ля-ля», напяванні імені дзіцяці — «Оля, Оля, Олечка», гукаперайманні — спявае мішка «у-у», лялька «ля-ля», коцік «мяў-мяў» і інш.) у розных рэгістрах (высокім, сярэднім, нізкім). Развіццю ўстойлівай слыхавой увагі, тэмбравага слыху малышоў спрыяюць ігра дарослага на дзіцячых музычных інструментах (трыоле, маленькіх званочках рознага гучання, металафоне, дзіцячым гармоніку, трохвугольніку, бразготках, дзіцячым барабанчыку, гуслях, дудачцы).

Педагог стымулюе пошук дзіцем крыніцы музычнага гуку.

Імкнучыся ўзбагаціць музычныя ўражанні малышоў, прапануем для праслухвання невялікія п'есы класічнай музыкі (В.Моцарта, І.Баха, Ф.Шуберта, А.Вівальдзі), дзіцячыя песенькі, творы народнай, сучаснай музыкі, якія гучаць у грамзапісу. Рэкамендуецца музыка, якая выклікае ў дзяцей станоўчыя эмоцыі (бадзёрая, спакойная, радасная, жартаўлівая, пяшчотная).

Мастацкія творы, іх даступнасць — значныя крытэрыі, на якія абапіраецца дарослы пры выбары музыкі для дзяцей. Пры гэтым неабходна мець пачуццё меры, «зваротную рэакцыю», характар успрымання прапанаванай мелодыі канкрэтным дзіцем.

Далучэнне да музыкі дзяцей першага года жыцця ажыццяўляецца таксама праз музычна-рухальны паказ і гульні-скокі. Педагог імкнецца даць дзецям радасць, задавальненне ад паказу цацак, якія рухаюцца пад свой спеў альбо пад музыку, што выконваецца на музычных інструментах ці ў грамзапісу. Выкарыстоўваюцца розныя цацкі: танцуе лялька, мішка, качка, скача зайчык (пад беларускія народныя мелодыі: *«Юрачка»*, *«Мікіта»*, *«Касіў Ясь канюшыну»*, ці пад польку, вальс — па выбары дарослага ў грамзапісу). Лялька ходзіць — гучыць марш, лялька спіць — выконваецца калыханка. Музычна-рухальныя паказы могуць суправаджацца ігрой на музычных інструментах. Пры гэтым стымулюецца дзіцячая актыўнасць. Выхавальнік паказвае, як ходзіць мішка, і прапануе дзіцяці стукнуць у бубен, прыгаворваючы «туп-туп-туп».

Дарослы і сам танцуе для дзяцей, імкнецца выклікаць у іх цікавасць да музычна-рытмічных рухаў.

Арганізуюцца з малышамі і кароткія танцы. Напрыклад, дарослы бярэ кісці рук дзіцяці, якое ляжыць у ложку, і па чарзе згінае і разгінае іх у локцях. Такія ж рухі выконваюцца і з ножкамі. Педагог па чарзе згінае і разгінае іх у каленях ці качае малыша ўлева — ўправа. Такі танец паўтараецца некалькі разоў.

У другім паўгоддзі дарослы заахвочвае малышоў да самастойных рухаў пад музыку (калі гучыць спакойная музыка, дзіця стаіць ці сядзіць; пад танцавальную мелодыю — падскоквае, з яе заканчэннем спыняе рух). Педагог вучыць малышоў пляскаць у далоні пад музыку, выконваць павароты кісцей рук, «спружынку», бакавое переступанне, кружэнне (з дапамогай дарослага).

Выкарыстоўваюцца разнастайныя музычныя творы: народныя — *«Юрачка»*, *«Калыханка»*, *«Маленькая кадриль»*, *«Во поле береза стояла»*, *«Гопак»* і інш.; аўтарскія, створаныя спецыяльна для дзяцей, — *«Кошка»* (муз. А.Аляксандрава, сл. М.Фрэнкеля), *«Топ-топ»* (муз. М.Красева) і інш.

Дарослы знаёміць дзіця з музыкай не толькі ў паўсядзённым жыцці, але і на спецыяльна арганізаваных занятках. З 2 — 3-месячнымі немаўлятамі музычныя заняткі праводзяцца індывідуальна, у другім паўгоддзі — як індывідуальна, так і з невялікай падгрупай (2 — 3 чалавекі). Змест і структура паступова ўдасканальваюцца з месяца ў месяц. Яны залежаць не толькі ад узроставых асаблівасцей, а і ад індывідуальных, ад музычнага развіцця немаўлят, іх здароўя, фізічнага стану ў кожны канкрэтны момант.

Важная ўмова, якая забяспечвае поспех у далучэнні дзіцяці да музыкі, — радасны эмацыянальны стан, які вызначаецца дарослым, яго спакойнымі, ласкавымі, цёплымі зносінамі з малышом.

## РАЗВІВАЕМСЯ Ў ДЗЕЙНАСЦІ

**• Зносіны**

*«Першае, што павінны выхаваць у нашых дзяцей і што развіваецца на працягу ўсяго дзяцінства, — гэта патрэбнасць дзяцей у чалавеку, у іншым чалавеку».*

**Д. Б. Эльконін**

Зносіны — першая і найбольш значная для дзіцяці дзейнасць, якой яно авалодвае. Спецыфічны сам прадмет яе — іншы чалавек. Немаўля патрабуе ўвагі дарослага, яго добразычлівых адносін да сябе, ласкі. Гэта патрэбнасць задавальняецца праз сітуатыўна-эмацыянальныя зносіны. Для дзяцей першага паўгоддзя жыцця характэрна *эмацыянальна-асобасная форма — вядучая дзейнасць*. Дзіця не валодае маўленнем, але для ўплыву на дарослага прымяняе міміку, эмацыянальна выразны голас — і, часцей за ўсё, дабіваецца, чаго хоча. Менавіта развіццё гэтай дзейнасці вызначае галоўныя змяненні ў псіхіцы немаўляці. Але гэта не адзіная форма ўзаемадзеяння паміж дарослым і малышом першага года жыцця.

Падрастаючы, усё часцей дзіця мае патрэбу не толькі ў пяшчоце, увазе, а і ў супрацоўніцтве з дарослым пры асваенні свету, пры знаёмстве з прадметамі навакольнага асяроддзя. Для дзелавога ўзаемадзеяння патрэбны іншыя сродкі, прадметна-дзейсныя.

З другога паўгоддзя малышы ўступаюць з дарослымі *ў асобасна-дзелавую (сітуатыўную) форму зносін*, дзе адначасова задавальняецца патрэбнасць дзіцяці ў супрацоўніцтве з дарослым і ва ўвазе з яго боку. Толькі ўпэўніўшыся ў добразычлівых адносінах дарослага, дзіця набывае гатоўнасць для ўспрымання дзелавой інфармацыі.

**У такіх зносінах маюць патрэбу дзеці ў канцы першага года жыцця.**

✓ **Асноўная мэта:** развіццё патрэбнасцей малюткі ў зносінах і фарміраванне спосабаў яго ўзаемадзеяння з дарослым чалавекам.

✓ **Задачы:**

**1-ы перыяд — нованароджанасці (першы месяц жыцця).**

Спрыяць узнікненню патрэбнасці ў зносінах: настройваць дзіця на ўспрыманне дарослага, садзейнічаць яго вылучэнню, узнікненню засяроджанасці на твар дарослага і на яго ўсмешку.

**2-і перыяд — з 2-га па 6-ы месяц жыцця.**

Задавальняць патрэбнасць дзіцяці ў добразычлівых адносінах і ўвазе з боку дарослага.

Спрыяць развіццю сродкаў эмацыянальных сітуатыўна-асобасных зносін («комплекс ажыўлення»), ствараць умовы для своечасовага ўзнікнення лепетных вакалізацый; выкарыстоўваць сітуатыўна-асобасныя зносіны для ўсебаковага развіцця немаўляці: фарміравання станоўчага самаадчування, прыхільнасці і асноў даверу да даглядаючага дарослага, пазнавальнай актыўнасці, накіраванай на навакольныя прадметы, спрыяць устанаўленню дзеянняў хапання і ўтрымлівання.

**3-і перыяд — другое паўгоддзе жыцця дзіцяці (з 6-га па 12-ы месяц).**

Спрыяць з'яўленню ў дзіцяці патрэбнасці ў супрацоўніцтве.

Максімальна задавальняць асобасныя і дзелавыя матывы зносін малыша.

Развіваць вербальныя і невербальныя спосабы і сродкі зносін.

Фарміраваць у дзіцяці фанематычны слых і разуменне слоў да-

рослага. Ствараць прыдатныя ўмовы для развіцця перадумоў уласнага маўлення. Спрыяць актыўным вакалізацыям дзіцяці — лепету, першаму лепетнаму маўленню. Стымуляваць з'яўленне першых слоў, імкненне імі карыстацца як сродкам зносін з дарослым.

Узбагачаць узаемадзеянне з дзіцем яркай, выразнай вобразнай мовай. Падтрымліваць пазітыўныя адносіны дзіцяці да сябе, развіваць цікавасць і ўвагу да блізкіх людзей, замацоўваць яго давер да дарослага.

## ЗМЕСТ І ЎМОВЫ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАЦЫ

Дарослы чалавек і дзіця...

Менавіта дзякуючы іх узаемадзеянню ў малога з'яўляецца патрэбнасць у зносінах. Дарослы клапоціцца аб немаўляці з першых дзён жыцця, аберагае яго ад непрыемных уздзеянняў, стварае адчуванне абароненасці. Ён задавальняе патрэбнасць дзіцяці ва ўражаннях і становіцца для малога найбольш прывабным аб'ектам.

Узаемадзейнічаючы з малышом, трэба ставіцца да яго як да цікавай, жаданай асобы. Дарослы размаўляе з дзіцем як з разумным партнёрам па зносінах, нібы здольны зразумець усе яго словы і дзеянні. Ён шырока выкарыстоўвае міміку, жэсты, імкнецца адрозніць адценні плачу — ад дыскамфорту, ад страху, плачзаклік, плач-спачуванне і па-рознаму адказаць. Пры гэтым дарослы гатовы раздзяліць перажыванні малюткі («Таня плача, у яе баліць горлачка. Мы яе палечым, прагонім боль...»), вербалізуе дзіцячыя эмоцыі («Сашачку падабаецца купацца. Вадзічка цёпленькая, прыемная. Вось як добра!»), імкнецца стварыць агульны станоўчы фон зносін. Ва ўзаемадзеянні з малышом гэтаму спрыяе выкарыстанне пацешак, прымавак, напеўных вершаў (*«Лады-ладкі»*).

**Недапушчальна праяўленне абыякавасці да дзіцяці. Трывалыя эмацыянальна-асобасныя зносіны малыша з дарослым — гэта аснова эмацыянальнай ураўнаважанасці немаўляці.** Для дасягнення гэтага важна, каб у дашкольнай установе кожнае дзіця абслугоўвала невялікая колькасць дарослых, лепш за ўсё — адзін выхавальнік. Гэта аблягчае ўзаемапаразуменне паміж дзіцем і дарослым, паглыбляе іх эмацыянальны кантакт, спрыяе з'яўленню значных для дзіцяці афектыўна-асобасных сувязей.

Дарослы, які выхоўвае дзіця, з другога паўгоддзя актывізуе ў немаўляці дзелавыя матывы зносін — паказвае нескладаныя дзеянні з цацкамі, прадметамі яркай афарбоўкі, акцэнтуе ўвагу на рухах, змяненні іх становішча ў прасторы; заахвочвае сумесную дзейнасць з цацкай — дае патрымаць стрыжань пірамідкі пры надзяванні кольцаў, прапануе падаць мяч у гульні, разам збіраць цацкі ў скрынку і г.д.

У паўсядзённых зносінах неабходна інфармаваць дзіця аб сваіх дзеяннях («Будзем есці», «Надзенем Настачцы шапачку» і г.д.). Трэба праяўляць вытрымку, чакаючы актыўных дзеянняў з боку дзіцяці. Залішняя паспешлівасць, абыякавасць вельмі небяспечныя для немаўляці — яны затрымліваюць праяўленне ўласнай актыўнасці малыша. Разам з тым адзначаецца, што чым больш чула і ўважліва дарослы ставіцца да малышоў, тым раней праяўляецца іх «Я».

Дарослы прыбягае да моўных зносін не толькі пры кіраўніцтве ўспрыманнем дзіцяці. У час кармлення, апранання, умывання дзіцяці дарослы стымулюе дзейнасць малыша словамі *дай, пі, кладзіся, спі, сядай* і г.д. У далейшым словам стымулююцца і больш складаныя дзеянні малыша («Вазьмі зайку і пакладзі яго на ложак»), дзіця вучыцца спыняць непажаданае дзеянне пасля слоў дарослага.

Дарослы не толькі вучыць малога новым дзеянням, а імкнецца, каб дзіця разумела, што гэтыя дзеянні значаць («Патрасі бразготку», «Памашы ручкамі», «Да пабачэння», «Пакладзі цацку ў скрыначку» і г.д.).

Для развіцця разумення мовы дарослага праводзяцца і спецыяльныя гульні-заняткі (*«Лялька прыйшла ў госці да дзяцей»*, *«Птушка прыляцела»*, *«Паказ прадметаў з мяшочка»* і інш.).

Фарміруюцца ў немаўляці і вербальныя сродкі зносін. Дарослы імкнецца падтрымаць у дзіцяці «комплекс ажыўлення», у які ўваходзяць і галасавыя рэакцыі, гуленне. Калі з'яўляецца здольнасць выгаворваць асобныя гукавыя спалучэнні, паўтараць іх, дарослы актывізуе лепет дзіцяці, вучыць малыша паўтараць гукі (а-а-а, у-у-у), чаргаваць іх.

Пасля 10 месяцаў дарослы стымулюе дзіця да паўтарэння такіх гукаспалучэнняў, якія пакуль што адсутнічаюць у мове малыша. Калі дзіця навучылася паўтараць склады, дарослы імкнецца выклікаць у дзіцяці з'яўленне першых слоў, падбіраючы для заняткаў пацешкі, дзе простыя словы і склады знаходзяцца пад націскам (*«Кіска»*, *«Заінька»*).

Моўнае развіццё дзіцяці адбываецца хутка і лёгка тады, калі яно звязана з блізкім і знаёмым дарослым. Глыбокія эмацыянальныя сувязі выклікаюць у дзіцяці камфортны стан, павышаюць цікавасць, увагу да мовы. У значнай ступені дзякуючы гэтаму ў перыяд давербальных зносін фармі-руецца найбольш дасканалы сродак чалавечых зносін — мова.

## ДАПАМОЖАМ НАШЫМ ВЫХАВАНЦАМ

Нашы малюткі растуць вельмі хутка і за адзін год праходзяць значны шлях у сваім развіцці. Дарослы, які ажыццяўляе догляд за малым, павінен не прагледзець тэрмін з'яўлення новаўтварэнняў. Істотнае спазненне новаўтварэнняў, набыткаў, якія характэрны для першага года жыцця дзіцяці, можа выклікаць негатыўныя вынікі, якія адгукнуцца на далейшым жыцці дзіцяці. Ад дарослага патрабуецца павышаная ўвага, назіральнасць, цеплыня і кампетэнтнасць, каб заўважыць адхіленні ў развіцці малютак і своечасова аказаць ім дапамогу.

Умацаванне здароўя неабходна для паўнацэннага фізічнага і псіхічнага развіцця.

Асаблівай увагі патрабуюць дзеці з затрымкай сенсаматорнага развіцця. У першыя месяцы жыцця трэба забяспечыць засяроджванне дзіцяці на прадмеце, развіццё прадметнага ўспрымання, праяўленне першых накіраваных дзеянняў да прадметаў (абмацванне, схопліванне і інш.).

Прадметам карэкцыі ў групе «Малютка» можа быць развіццё каардынацыі, пошукавых дзеянняў шляхам паступовага ўскладнення сенсаматорных задач, прапануемых дзецям.

У другой палове года трэба звярнуць увагу на поўзанне і дапамагчы тым, хто яшчэ не авалодаў гэтым дзеяннем. Ствараючы

спрыяльныя ўмовы для гэтага руху, стымулюючы ўменне сядзець, стаяць (спачатку з апорай на прадмет, а потым і без яго), дапамагаючы рабіць першыя самастойныя крокі, мы спрыяем развіццю ўсёй касцёва-мышачнай сістэмы дзіцяці. Больш таго, пры гэтым фарміруецца і зрокава-рухальная каардынацыя, пашыраецца дыяпазон успрымання, уяўленняў немаўляці аб прадметах, фарміруюцца дыферэнцыраваныя адносіны да іх. Аказваючы дапамогу ў авалоданні асноўнымі рухамі, першымі прадметнымі дзеяннямі, у развіцці каардынацыі, мы спрыяем і развіццю актыўнасці дзіцяці.

Асобы клопат неабходны дзецям, якія маюць спазненні ў развіцці зносін, як эмацыянальна-асобасных, так і сітуатыўна-дзелавых (у пераходзе да іх у другім паўгоддзі жыцця). Дапамога патрабуецца немаўлятам з затрымкай у разуменні мовы дарослага, яна палегчыць арыенціроўку ў наваколлі. Авалоданне здольнасцю разумець мову дарослага ліквідуе значную частку цяжкасцей у фарміраванні пачаткаў прадметнай дзейнасці немаўляці ў канцы першага года жыцця. Маюць патрэбу ў дапамозе і дзеці, у якіх спазняюцца перадумовы ўласна-актыўнай мовы (гуленне, лепет, першыя словы).

Асаблівай увагі патрабуюць дзеці з недаразвіццём пачуццёвай сферы, чые эмацыянальныя рэакцыі аднастайныя, у якіх слабая цікавасць да наваколля, адсутнічаюць індывідуальныя адносіны да жыццёвага распарадку. Адхіленні назіраюцца пераважна ў дзяцей, якія выхоўваюцца ва ўстановах інтэрнатнага тыпу (дом немаўляці і інш.). Галоўная прычына — дэпрывацыя, ушчамленне патрэбнасці ў зносінах, безасабовасць сувязей дарослага і дзіцяці, адсутнасць агульнай дзейнасці, асобаснага кантакту. Асноўны напрамак у карэкцыйнай рабоце з дзецьмі — ліквідацыя дэманстратыўнай формы безасобаснага, павярхоўнага падыходу, актывізацыя эмацыянальна-асобасных зносін з дзіцем.

Мова дарослага павінна быць максімальна адрасавана канкрэтнаму дзіцяці, трэба дамагацца наладжвання кантакту поглядаў. У працэсе зносін неабходна рабіць паўзы ў сваіх дзеяннях працягласцю 35 — 40 секунд, даючы немаўляці магчымасць аказаць і праявіць ініцыятыву. Немалую ролю адыгрывае падтрымка такой актыўнасці дзіцяці з боку дарослага (усмешка, словы, пагладжванне і інш.)

**Негатыўныя адхіленні ў развіцці немаўляці хутчэй удаецца ліквідаваць, калі:**

- *дарослыя ўключаюцца ў сумесную актыўную дзейнасць, у якой дзіця — не прадмет дзеяння, а суб'ект, актыўны яе ўдзельнік;*
- *асаблівая ўвага ўдзяляецца вядучай у гэтым узросце дзейнасці — зносінам;*
- *адсутнічае жорсткая рэгламентацыя дзіцячай дзейнасці, даецца паказ розных спосабаў выкарыстання цацак, заахвочваецца ініцыятыва, самастойнасць дзіцяці;*
- *праяўляецца клопат аб развіваючым прадметным асяроддзі;*
- *з дзецьмі працуе кваліфікаваны педагог, выключана частая змена дарослых, у выхаванні галоўным паказчыкам з'яўляецца любоў і добразычлівасць да выхаванцаў.*

* * *

**Над распрацоўкай гэтай часткі праграмы працаваў творчы калектыў пад кіраўніцтвам кандыдата псіхалагічных навук, прафесара Л.А.Панько. У яго састаў уваходзілі: кандыдат педагагічных навук, прафесар В.А.Шышкіна, кандыдат псіхалагічных навук А.Л.Гуткоўская, старшы выкладчык Л.А.Мельнічук, заслужаны работнік народнай адукацыі, музычны кіраўнік дзіцячага сада № 160 г.Мінска А.Р.Рэмізоўская, выкладчык Т.М.Марданава.**

*Табліца да стар. 9.*

| Узрост (у месяцах) | Паказчыкі рухальнага развіцця |
|---|---|
| 1 | Скурна-мышачныя рэфлексы: падэшвенны, нажны ў гарызантальным становішчы (рэфлекторнае поўзанне) і ў вертыкальным становішчы (апорная рэакцыя), спінны.<br>У вертыкальным становішчы дзіця галаву не ўтрымлівае, а лежачы на жываце, галаву ўздымае |
| 2 — 3 | Рэфлексы становішча: шыйны рэфлекс у становішчы на жываце і на баку (на вісу).<br>У вертыкальным становішчы дзіця галаву ўтрымлівае, а лежачы на жываце, уздымае.<br>Пераважае дыфузная рухальная актыўнасць |
| 3 — 4 | Шыйны рэфлекс у становішчы лежачы на спіне (на вісу).<br>У становішчы лежачы на жываце дзіця ўздымае тулава, абапіраючыся на перадплеччы, стаіць пры падтрымцы пад пахі.<br>Дзіця пераварочваецца са спіны на бок, сядзіць пры падтрымцы за рукі.<br>Першыя мэтанакіраваныя рухі; узнікненне зрокава-маторнай каардынацыі, развіццё ўмення утрымліваць прадмет у руцэ |
| 5 — 5,5 | Дзіця пераварочваецца са спіны на жывот. У становішчы лежачы на жываце прыўздымае тулава, абапіраючыся на выпрастаныя рукі; сядзіць пры падтрымцы пад пахі |
| 6 — 7 | Дзіця паварочваецца з жывата на спіну. Спрабуе схапіць цацку. Устае на карачкі |
| 7 — 8,5 | Дзіця сядзіць без падтрымкі, поўзае, пераступае пры падтрымцы за рукі, сядае са становішча лежачы і кладзецца са становішча стоячы, устае на ногі, трымаючыся за нерухомую апору (бар'ер) і сядае. Хапае і ўтрымлівае цацку |
| 9 | Спрабуе устаць, стаіць пры падтрымцы за руку, пераступае, трымаючыся дзвюма рукамі за нерухомую апору, узлазіць на карачках па прыступках лесвіцы, «горкі» |
| 10 | Самастойна ўстае, пераступае, трымаючыся дзвюма рукамі за рухомую апору (каталку) |
| 11 — 12 | Дзіця стаіць без падтрымкі, пераступае з падтрымкай за руку |
| 12 | Дзіця прысядае, устае, пераступае без апоры (пачатковая хадзьба) |